# ВыРАЗНАЯ сімвалічнасць

## Новыя і традыцыйныя формы выцінанкі сышліся ў сталічнай галерэі



Вольга Налівайка «Восень».

Здаўна выцінанка ўпрыгожвала хаты нашых бабуль, была неабходным складнікам сялянскага побыту, не страціла сваёй традыцыйнай глебы, пры тым, што цяпер развіваецца і ў новых формах. У мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» ў выставачным праекце «Чароўны свет выцінанкі» прадстаўленыя разнастайныя формы беларускай выцінанкі майстрых Галіны Жураўлёвай, Наталлі Клімко, Наталлі Клютко, Вольгі Налівайка і Валянціны Слюнчэнка. Аўтары прыехалі ў Мінск з розных рэгіёнаў Беларусі.

Выстаўка размеркавана ў дзвюх залах. У першай адразу нават складана зразумець, што мы глядзім на выцінанку: узоры, прадстаўленыя ў рамах і пад шклом, нагадваюць жывапісныя творы і раскрываюць сучасныя тэмы, такія як шлюб у розных краінах свету альбо захаванне роднай прыроды. Кожны твор аздоблены сімвалічнымі дэталямі. Другая зала больш традыцыйная: дэманструецца інтэр'ер сялянскай хаты.

— У беларускіх хатах, у асноўным на вёсцы, заўсёды ўпрыгожвалі чырвоны кут — іконай, якая была багата аздоблена выцінанкай, таму што ікона займае самае значнае месца ў хаце, — расказала майстрыха з Івацэвіцкага раёна Наталля Клютко. — Раней вешалі на вокны фіранкі з выразанымі кветкамі, што нагадвалі ручнікі, аздаблялі сцены, хатнія слупы. Фіранкі мянялі ў асноўным да значных свят — на Вялікдзень альбо Раство. Але ж былі і такія майстрыхі, якія маглі мяняць іх кожны тыдзень. Ведаю прыклады, калі і ў нашы дні майстрыхі працягваюць выцінанкай упрыгожваць свае дамы так, як рабілі яшчэ ў сярэдзіне дваццатага стагоддзя. Дарэчы, раней узоры для выцінанак перадаваліся ад бабуль. Сёння ў нас з'явіўся інтэрнэт, можна вывучаць узоры ўсяго свету, што дае магчымасць развіваць нацыянальную выцінанку. На разнастайных фестывалях выцінанкі мы знаёмімся з майстрамі, абменьваемся досведам.

Кожная з аўтараў выстаўкі прыйшла да выцінанкі невыпадкова. Па-першае, як адзначаюць майстрыхі, у іх заўсёды была цікавасць да беларускай культуры і гісторыі. Па-другое, выцінанка насычае станоўчай энергіяй. Па-трэцяе, людзі, якім цікава працаваць рукамі, паспрабаваўшы аднойчы выразаць выцінанку, потым не могуць спыніцца.



Наталля Клютко. Фіранка «Анёлы».

— Аднойчы ад школы, у якой працую, я паехала на курсы павышэння кваліфікацыі. Мне пашчасціла з выкладчыцай Нінай Міхайлавай, якая паказала, як працаваць у тэхніцы выцінанкі, — успамінае Наталля Клютко. — Акрамя беларускай, выкладчык паказвала яшчэ кітайскую тэхніку, адметную тым, што выцінанку там рэжуць вельмі тонка. Беларуская тэхніка таксама прыцягальная. Прыехаўшы дадому, я зрэзала некалькі ўпаковак паперы… Перад тым, як зрабіць першую фіранку, я задумалася: што як жанчына магла б адлюстраваць, які сэнс хацела б укласці. Я звярнулася да беларускага нацыянальнага арнаменту. Першае, што вырашыла выкарыстаць, — сімвал жаночай долі, але з добрым сэнсам. Пасля — сімвал дружнай сям'і і, вядома, сімвал багацця. У сукупнасці фіранка стала нібыта талісманам. А далей пачалі прыходзіць самыя розныя ідэі.

Важна, што сёння цікавасць да выцінанкі з боку аматараў мастацтва ўзрастае. Людзі шукаюць майстроў, у якіх можна зрабіць заказы. Хтосьці прыносіць старыя фотаздымкі, на якіх захаваныя выявы выцінанак, якія былі раней у іх вёсках, хтосьці просіць арыгінальныя ўзоры, каб упрыгожыць імі кватэру, ну, а хтосьці наогул калекцыянуе.

— Цікавасць да выцінанкі павялічваецца, — падкрэсліла Наталля Клютко. — Калі прыязджаем на выстаўкі, зацікаўленыя прыходзяць і ўлюбёна глядзяць на нашыя творы, адразу ўспамінаюць хаты сваіх бабуль, расказваюць, якімі выцінанкамі аздаблялі дамы іх бацькі. Беларускую выцінанку вельмі любяць палякі — ахвотна купляюць яе ў айчынных майстроў. Сёлета на выстаўцы ў Польшчы адна жанчына, якая мае беларускія карані, стаяла дзень і глядзела на маю ікону, пасля спытала цану і пайшла. На наступны дзень вярнулася да мяне і сказала, што вельмі хоча набыць ікону, каб у яе засталася памяць пра продкаў, якія жылі на Гомельшчыне. У той момант я захацела ікону падарыць, але яна ўсё роўна пакінула мне грошы. Цешыць, што творы набываюць ўдумліва.

Выцінанка як кірунак традыцыйнай культуры — нацыянальны брэнд: у гэтай тэхніцы цяпер ствараюцца сапраўдныя творы станковага мастацтва.

**Вікторыя АСКЕРА,**
**фота аўтара**



Галіна Жураўлёва «Райскі сад».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ